# *БЕЛАРУСКІ СТРОЙ*

## *Каталог традыцыйнага адзення на Беларусі канца XIX – пачатку XX стагоддзяў па рэгіёнах З калекцыі гурта VOLYA, Сіэтл, ЗША*

**Кантакт:** Воля Дземка, аўтар праекта
volyagroup.nonprofit@gmail.com
Тэлефон: (+1) 206-659-7811

Белы, чырвоны, чорны. 100% хэнд-мэйд па старадаўніх тэхналогіях. Непаўторнае хараство і багацце беларускай культуры. Знаёмцеся: каталог традыцыйнага адзення Беларусі канца XIX - пачатка XX стагоддзяў па рэгіёнах. Строі, у якіх у мінулым красавалі беларускі, не адзін год збіралі, аднаўлялі і рэканструявалі паводле старых фотаздымкаў нашы сучаснікі – спявачка, кінавытворца і прадзюсарка Воля Дземка, якая зараз жыве ў Сіэтле (ЗША) і яе паплечніцы з фальклорнага гурта VOLYA.

У каталогу прадстаўленая адна з найбуйнейшых прыватных калекцый беларускага народнага строю, сабраная па-за межамі краіны. 16 поўных камлектаў з 79 прадметаў жаночага адзення і аксэсуараў ад 1880-х да 1940-х гг, якія дагэтуль нідзе не выстаўляліся. Дызайн і аздабленне ўбораў адлюстроўваюць адметнасці пяці з шасці гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі.

За кожным прадметам свая гісторыя, спалучэнне шчаслівага выпадку, звычайнага цуду і імпэту людзей, улюбёных у беларускую народную культуру. Калекцыя пачалася больш як 10 гадоў таму з няглюбскае кашулі, якую Воля Дземка знайшла на eBay як “русское платье”. (Для даведкі: неглюбскія тэкстыльныя традыцыі ўваходзяць у дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі). Калісьці гэтую кашулю саткала і расшыла для свайго вяселля сялянка з Веткаўскага раёна Гомельшчыны. Сёння ж гэты строй – частка важнай працы па захаванні традыцыйнай беларускай культуры.

Гурт VOLYA, які з 2009 года знаёміць слухачоў у ЗША з аўтэнтычнымі беларускімі песнямі (дарэчы, многія з іх сягаюць каранямі ў дахрысціянскія ці сярэднявечныя часы), таксама займаецца і аднаўленнем аўтэнтычных беларускіх строяў. З гэтай мэтай была створаная нават асобная недзяржаўная ўстанова – “Цэнтр па вывучэнні, зборы і аднаўленні матэрыяльнай і нематэрыяльнай беларускай культуры”. Некаторыя ўборы спявачкі атрымалі ў спадчыну ад сваякоў, іншыя набылі на міжнародных аўкцыёнах кшталту eBay і Etsy. Колькі строяў падарылі дзяўчатам героі дакументальнага фільма аб знікаючых культурных традыцыях “Песні старой Еўропы – старадаўнія беларускія песні”, матэрыял для якога збіраўся ў 2011 годзе ў этнаграфічных экспедыцыях па Гомельшчыне і Берасцейшчыне.

На 50 старонках – не проста традыцыйныя жаночыя ўборы і іх рэгіянальныя адметнасці. Тут ажывае гісторыя краіны, прашытая сімваламі на кашулях, хустках і фартухах, напоўненая ўрачыстым настроем, прасякнутая цеплынёй ўмелых рук беларускіх майстрых.

**Сайт праекта:** *volya.weebly.com/costumes*